Дняпром», «Восеньскі настрой» (усе 2013), «Пасля дажджу» (2014); партрэты В.Маслюка (1987), «Мае бацькі. Май 1945» (1995), В.К.Бялыніцкага-Бірулі (1998), П.Труса (1999), «Я.Купала і М.Чурленіс у Вільні» (1999), В.П.Пракапцовай (2005), Э.В.Малафеева (2009) і інш.

*Г.А.Фатыхава.*

**МАСЛЕНІЦА**, Масленка, Сырны дзень, Запусты, старажытнае перадвеснавое свята праводзін зімы. Пачынаецца за 8 тыдняў да Вялікадня (у розныя гады паміж 7 лют. і 14 сак.). Святкавалі некалькі дзён, у вёсцы звычайна М. пачыналася ў чацвер. У дахрысціянскі перыяд свята было прысвечана апекуну сялянскай гаспадаркі Вялесу — ахоўніку хатняй жывёлы. Усе абрадавыя дзеі М. (гушканне на арэлях, катанне на санях, спальванне пудзіла і інш.) прасякнуты элементамі магіі, верай, што яны забяспечаць ахову сям'і і грамады ад уздзеяння варожых сіл. У 17—18 ст. М. набылі характэрныя карнавальныя рысы: пераапрананні, хаджэнні з песнямі па хатах, абліванні вадой, выступленні батлейкі і інш. На М. абавязкова пяклі бліны, якія сімвалізавалі сонца. На мясапусным тыдні наладжваліся «запускі» на каўбасу і мяса, сваякі ездзілі адзін да аднаго ў госці, адведвалі бабку-павітуху. У апошні дзень М. бытаваў сямейны звычай даравацць крыўды («даравальная нядзеля»), заканчвалася свята «запускамі» на малочныя стравы, пасля чаго пачынаўся пост. У апошнія 2 дні М. весела каталіся на конях, упрыгожаных стужкамі і званочкамі. Пэўную ролю свята адыгрывала ў працэсе сацыялізацыі асобы. У разнастайных формах гульнявой, сімвалічнай, вербальнай ці метафарычнай моладзь далучалася да здабыткаў духоўнай культуры народа, пачынала асэнсоўваць сябе як частку абшчыны. Традыцыі М. захаваліся ў сучасным святкаванні праводзін зімы.

*А.М.Аляхновіч.*

**МАСЛЕНІЧНЫЯ ПЕСНІ**, запусныя песні, каляндарна-абрадавыя творы, прымеркаваныя да *Масленіцы.* Звязаны з заканчэннем зімы і пачаткам вясны. Раскрываюць сэнс рытуальных дзей, іх сімволіку, глыбінныя вытокі абрадава-святочнай культуры. Яны дапамагаюць зразумець розныя аспекты сац. узаемаадносін людзей, ствараюць святочны настрой, малююць вобраз самога свята: А ўжо, дзевачкі, Масленка, Масленка, // Прыляцела ластаўка, ластаўка. // Села яна на калу, на калу, // Кідала масла на каму, на каму, // А хто зловя, той таму, той таму. М.п. перадаюць атмасферу свята, яго карнавальную сутнасць і магію. Масленіца выступае ў іх як адухоўленая анімістычная істота. Адбілася ў песнях і тэматыка, прысвечаная ахоўніку жывёлы Вялесу (валасевыя песні), хаця свайму прызначэнню яны адпавядалі фармальна, насілі агульны застольны настрой і выконваліся ў гонар свята жывёл. Хрысціянскі падтэкст заўважны ў М.п. пра Вял. пост, які надыходзіць пасля Масленіцы: Нас масленка абманіла, абманіла, // На сем нядзель пасгта пысадзіла, пысадзіла. Прыкметнае месца займалі песні на сюжэты магічна-заклінальнага змесгу, што спяваліся маладым замужнім жанчынам з пажаданнем нарадзіць сына ці дачку, а таксама любоўна-шлюбнай і сямейнай тэматыкі. Мажорныя па гучанні, аднагалосыя па сваёй будове, напоўненыя рухам М.п. перадаюць радасць з нагоды свята. На працягу гіст. развіцця яны прайшлі складаны шлях эвалюцыі, вылучаючы тыя, што найб. адпавядаюць настрою і густам сучаснага грамадства.

*А.М.Аляхновіч.*

**МАСЛЮК** Валерый Васілевіч (30.3.1953, в. Ропна Полацкага р-на — 26.8.2001), беларускі рэжысёр. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1979). Працаваў у Бел. тэатры імя Якуба Коласа (у 1993—96 дырэктар; да 1997 маст. кіраўнік). Адначасова ў 1981—83 гал. рэж. Магілёўскага абл., у 1983—91 — Дзярж. рус. драм. тэатраў. Пастаноўкі М. відовішчныя, метафарычныя, асацыятыўныя. У рэжысуры спалучаў псіхалагізацыю



*В.В.Маслюк.*

характараў з вобразнай умоўнасцю сучаснай тэатр. эстэтыкі. Сярод спектакляў: «Брыльянт» Е.Пшаздзецкага (1979), «Стары дом» А.Казанцава, «Клеменс» К.Саі (абодва 1980), «Закон вечнасці» паводле Н.Думбадзэ, «Візіт дамы» («Візіт старой дамы») Ф.Дзюрэнмата (абодва 1981), «Тутэйшыя» паводле твораў Я.Купалы, «Каханне, джаз і чорт» Ю.Грушаса, «А хтосьці выпаў з гнязда» паводле Д.Васермана (усе 1982), «Бабскае царства» Ю.Нагібіна, «Гамлет» У.Шэкспіра, «Усё ў садзе» Э.Олбі (усе 1984), «Знак бяды» В.Быкава (1985), «Кароль Лір» У.Шэкспіра (1994), «Жаніцьба» М.Гогаля (1996), «Сола для гадзінніка з боем» О.Заградніка (1998) і інш. Аўтар п'ес «Судны дзень» паводле аповесці «Суд у Слабадзе» В.Казько (паст. 1982), «Пакахай мяне, салдацік» паводле В.Быкава (паст. 1997), «Пад сонцам» (паст. 1999) і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1986.

**МАСОНСТВА**, франкмасонства (франц. franc-maçon літаральна вольны муляр), вучэнне і практыка найбуйнейшага міжнар. тайнага т-ва элітарнага тыпу, якое аб'ядноўвае людзей розных нацыянальнасцей і веравызнанняў пад эгідай пошуку «сапраўдных шляхоў духоўнага аднаўлення грамадства». Гал. мэтамі дзейнасці М. абвешчаны дабрачыннасць, маральнае ўдасканаленне (у большасці выпад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ